# АНАТОЛЬ ВАСІЛЬЕВІЧ ШАРКОЎ ВЕХІ НАВУКОВАЙ БІЯГРАФІІ І ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВАЯ СПАДЧЫНА

3 красавіка 2020 года ва ўстанове адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт» прайшла XIX міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць», прысвечаная 75-й гадавіне Вялікай Перамогі. Важнай асаблівасцю чарговай навуковай сустрэчы гісторыкаў Беларусі, Германіі і Расіі з'яўлялася абмеркаванне праекта «Жыць і памятаць» і серыі кніг А. В. Шаркова і А. І. Харашэвіч, вылучаных для ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь 2020 года ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

Адкрываў мерапрыемства па абмеркаванні прадстаўленных на выставе ў Цэнтры беларускай мовы і культуры выданняў загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Сяргей Яўгенавіч Новікаў, які ва ўступным слове звярнуў увагу ўдзельнікаў на той сумны факт, што два з паловай месяцы таму пайшоў з жыцця вядомы беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар Анатоль Васільевіч Шаркоў. Цягам апошніх 18 гадоў ён

з'яўляўся актыўным удзельнікам вясновых сустрэч у МДЛУ, выступаў рэцэнзентам першых двух зборнікаў матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць», пачынаючы з 2004 г. уваходзіў у склад рэдакцыйнай рады гэтага выдання. Гісторык выступаў з навуковымі дакладамі і паведамленнямі, быў нязменным мадэратарам на шматлікіх пасяджэннях, актыўна дыскутаваў па актуальных пытаннях гісторыі Беларусі ўвогуле і гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў прыватнасці. Прагучалі словы таксама пра тое, што А. В. Шаркоў перадаў у якасці дарункаў Цэнтру беларускай мовы і культуры і бібліятэцы МДЛУ шэраг сваіх аўтарскіх прац, у тым ліку тых, якія ў мінулым годзе вылучаны для ўдзелу ў конкурсе на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Сярод іх «Жить и помнить: Советские воинские захоронения в Европе», «Последний приют солдата», «Ставка Верховного главнокомандующего Русской армией в годы Первой мировой войны», «По следам Советско-польской войны».

Дазвольце коратка нагадаць аўтабіяграфію Анатоля Васільевіча Шаркова. Ён нарадзіўся 18 красавіка 1948 г. у г.п. Халопенічы Крупскага раёна Мінскай вобласці. У 1970 г. скончыў спартыўны факультэт Беларускага дзяржаўнага інстытута фізічнай культуры, у 1983 г. – Мінскую вышэйшую школу міліцыі. Майстар спорту СССР па біятлоне. У 1988 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю «Дзейнасць органаў унутраных спраў у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945)» (навуковы кіраўнік – прафесар А. М. Мацко). У 1998 г. абараніў доктарскую дысертацыю «Утрыманне і працоўнае выкарыстанне ваеннапалонных і інтэрніраваных на тэрыторыі Беларусі ў сістэму ўнутраных спраў (1944–1951)». Прафесар з 2001 г.

Працаваў трэнерам у Лагойску (1970–1975), у органах унутраных спраў Беларусі (1975–1988). З 1988 г. на выкладчыцкай працы ў МВШ МУС СССР (Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь), з 1993 г. – начальнік кафедры крымінальна-выканаўчага права, палкоўнік міліцыі. Ганаровы прафесар Акадэміі права і кіравання Міністэрства юстыцыі Расіі (2004). Адзін з распрацоўшчыкаў Крымінальна-выканаўчага кодэксу Рэспублікі Беларусь і Правілаў унутранага распарадку выканаўчых устаноў (2000). Член Савета Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь і член Савета па абароне дысертацый па юрыдычных навуках пры БДУ. Член рэдкалегіі навукова-тэарэтычнага часопіса «Веснік Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь», «Беларускага гістарычнага ча-сопісу», Весніка Акадэміі права і кіравання Мінюста Расіі «Человек: преступ-ление и наказание» і Інфармацыйнага навукова-метадычнага бюлетэня Дэ-партаменту выканання пакаранняў МУС Рэспублікі Беларусь. Прымаў удзел у ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС. Мае шматлікія ўзнагароды.

Прыярэтытнымі навуковымі інтарэсамі А. В. Шаркова з'яўляліся гісторыя органаў унутраных спраў Беларусі, Вялікая Айчынная вайна і праблемы ўдасканалення крымінальна-выканаўчага заканадаўства. Ён з'яўляецца аўтарам звыш 250 работ, у тым ліку звыш 10 манаграфічных выданняў.

Падачас пасяджэння ўдзельнікі канферэнцыі перш-наперш спыніліся на асобных момантах навуковай біяграфіі гісторыка Анатоля Васільевіча Шаркова. У яго навуковай дзейнасці прыярэтытнымі з'яўляіся праблемы, што былі звязаны з падзеямі ваеннай гісторыі Першай і Другой сусветнай, а таксама Вялікай Айчыннай войнаў. Але з асаблівай цікавасцю ён даследаваў матэрыял пра савецкіх і нямецкіх ваеннапалонных, загінуўшых і ахвярах вайны.

Далей адбылося абмеркаванне наступных прац А. В. Шаркова і А. І. Харашэвіч – «Последний приют солдата», «Ставка Верховного главнокомандующего Русской армией в годы Первой мировой войны», «Обелиски памяти Русской Императорской армии Первой мировой войны», «Жить и помнить», вылучаных на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры 2020 года.

«Последний приют солдата» (Мінск, Звязда, 2014). Як адзначыў кандыдат гістарычных навук дацэнт А. Г. Цымбал, кніга падрыхтавана і выдадзена да 100-й гадавіны з пачатку Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі, дзе пасля яе засталіся ваенныя пахаванні аўстра-венгерскіх, нямецкіх і расійскіх ваеннаслужачых на тэрыторыі Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей Рэспублікі Беларусь. Як у працы адзначаюць сааўтары А. В. Шаркоў, В. Д. Селяменеў, Ю.А. Бествіцкі, А. І. Харашэвіч, на цяперашні час захавалася 248 месцаў пахаванняў Першай сусветай вайны, з якіх 127 аўстра-венгерскія, 69 – рускія і 52 – нямецкія пахаванні. Найбольшая колькасць месцаў пахаванняў устаноўлена ў Гродзенскай вобласці – 107, Брэсцкай – 69, Мінскай – 54 і Віцебскай – 18. Пры гэтым аўтары аддзначаюць, што гэта далёка не канчатковыя лічбы. У кнізе прадстаўлены 248 месцаў вайсковых пахаванняў, 170 сталі аб'ектамі для кнігі.

Кніга знаёміць з многімі месцамі памяці, сярод якіх вылучаецца Смаргонскі раён, дзе ў гады Першай суственай вайны адбываліся пазіцыйныя баі паміж рускай арміяй і кайзераўскімі войскамі Германіі. Смаргонь чатыры разы пераходзіла з рук у рукі. У той час у лексікон ваеннаслужачых рускай арміі нават увайшла прымоўка: «Кто у Сморгони не бывал, тот войны не повидал». Пасля спынення кайзераўскіх войск, на тэрыторыі Беларусі пачалася гэтак званая пазіцыйная вайна на рубяжы супрацьстаяння дзвюх армій па лініі Дзвінск – Паставы – Нарач – Баранавічы – Пінск, якая працягвалася больш за два гады – з пачатку кастрычніка 1915 г. да сярэдзіны лютага 1918 г. толькі за 10 дзеён баёў, якія адбываліся ў сакавіку 1916 г. у час Нарачанскіх баёў, на 10 квадратных вёрстах руская армія панесла страты – 78 000 ваеннаслужачых. Значныя страты былі панесены праціўнікам. Усе яны былі пахаваны на беларускай зямлі: хавалі забітых і памерлых, як правіла, прытрымліваючыся пэўных рытуальных абрадаў. Пад пахаванні выбіралі найбольш падыходзячыя месцы – узвышшы, пагоркі, палі, узлескі. Пахаванні праводзілася і ў населеных пунктах, на тэрыторыях грамадзянскіх могілак, побач з цэрквамі і касцёламі. Па перыметры месцы пахаванняў агароджваліся, рабілся валы, усталёўваліся крыжы, помнікі і абеліскі, у шэрагу месцаў узводзіліся цэлыя мемарыялы з каменя і бетону. Аўтары прыходзяць да важ-

най высновы, што такая мемарыялізацыя была характэрнай для аўстра-венгерскіх і нямецкіх месцаў пахавання, на рускіх жа пахаваннях амаль паўсюль усталёўваліся драўляныя крыжы і агароджы. Пасля заканчэння вайны і ў пасляваенныя гады асобых работ па ўпарадкаванні і доглядзе за месцамі пахаванняў Першай сусветнай вайны на дзяржаўным узроўні ў Беларусі не праводзілася, яны былі фактычна забытыя. Выключэнне складалі некалькі брацкіх магіл расійскіх салдат, на якіх былі ўсталяваны або невялікія помнікі, або памятныя знакі.

А. В. Шаркоў адзначае, што новы перыяд, звязаны з аднаўленнем і ўладкаванне вайсковых пахаванняў Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі, пачынаецца з канца 1990-х гадоў, калі быў створаны Беларускі рэспубліканскі грамадскі аргкамітэт па ўшанаванні памяці салдат Першай сусветная вайны. Вялікую работу ў гэтым напрамку праводзіць Упраўленне па ўшанаванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны (Узброеныя сілы Рэспублікі Беларусь), пры якім дзейнічае 52-ы асобны спецыялізаваны пошукавы батальён. Было выяўлена, што ў Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях Беларусі ў цяперашні час захавалася 248 месцаў пахаванняў Першай сусветнай вайны: з іх 127 аўстра-венгерскіх, 69 рускіх і 52 – змешаных (ваеннаслужачых супрацьлеглых бакоў пасля баёў – часам хавалі разам).

Да кнігі зроблены вельмі важны дадатак «Карты вайсковых пахаванняў Першай сусветнай вайны». Сярод навуковых кансультантаў – доктар гістарычных навук А. В. Шаркоў, кандыдаты гістарычных навук В. І. Адамушка і В. Д. Селяменеў. Навуковае значэнне дадатку вызначаецца тым, што ўпершыню падрахтавана карта з абазначэннем месца пахавання і кароткай даведкай да кожнага з іх. Напрыклад, у Мінску на развілцы Старавіленскага тракту і вул. Чарвякова размешчаны брацкія ваенныя могілкі ахвяр Першай сусветнай вайны. Тут пахаваныя больш за 5 тысяч салдат і афіцэраў рускай арміі. Урачыста гэта месца было адкрыта 14 жніўня 2011 г. на каменных плітах, якія знаходзяцца побач з капліцай, ушанаваны імёны 2 468 чалавек.

Аб кнізе **«Ставка Верховного главнокомандующего Русской армией в годы Первой мировой войны»** (Мінск, 2014) распавёў кандыдат гістарычных навук старшы выкладчык кафедры агульнай тэорыі і права і гуманітарных дасцыплін БІП-Інстутута правазнаўства, Магілёўскага філіяла П. А. Канцавы.

Выступающий отметил, что книга А. В. Шаркова и Е. И. Хорошевич «Ставка Верховного главнокомандующего Русской армией в годы Первой мировой войны» является первой в отечественной историографии обобщающей работой по данной тематике. Авторами проанализированы многочисленные документы и мемуарные материалы, затрагивающие историю Ставки Верховного главнокомандующего Русской армией в годы Первой мировой войны на территории Беларуси. Именно комплексный подход позволил авторам прийти к обоснованным выводам и итоговым обобщениям, создать в результате законченное исследование.

В работе в хронологической последовательности проанализирована деятельность Ставки Верховного главнокомандующего Русской армией в годы Первой мировой войны. Раскрыты вопросы о составе Ставки и руководителях Штаба, структуре и комплектовании Русской армии, военные планы Ставки в начальный период и их реализация, передислокация Ставки и смещение Верховного главнокомандующего Русской армией при Великом князе Николае Николаевиче. Завершают главу уникальные фотографии, передающие реальные события тех лет и сюжеты истории Ставки и жизни Верховного главнокомандующего.

Во второй главе показаны события, происходившие в Ставке Верховного главнокомандующего Русской армией при императоре Николае II: представлено его окружение, дана зарисовки царской семьи, показана деятельность Ставки в ходе военной кампании 1916 года и планы на 1917 год; предательство и отречение. В главе 3 «Ставка Верховного главнокомандующего Русской армией при Временном правительстве» раскрыты вопросы о революционном хаосе в России и развале армии, Верховном главнокомандующем Русской армией, Л. Г. Карнилове, и предпринятых им мерах по спасению армии и государства, противостоянии Карнилова и Керенского, арест мятежных офицеров, их побеге из-под стражи. В главе 4 «Ставка Русской армии после Октябрьской революции» показаны события в Ставке при Верховном главнокомандующем Русской армией Н. Н. Духонине, а также этапы захвата Ставки революционными войсками во главе с Н. В. Крыленко, преобразования старой Ставки и армии, выход России из войны. Такой пошаговый подход авторов наиболее полно раскрывает особенности деятельности Ставки на разных этапах Первой мировой войны.

Книга А. В. Шаркова и Е. И. Хорошевич способствует сохранению памяти о событиях Первой мировой войны, проходивших на территории Беларуси. Фактический материал, приведенный в работе, выводы и обобщения авторов могут быть использованы в процессе преподавания дисциплин социально-гуманитарного цикла, а также стать основой для дальнейших исследований по данной тематике и по близким к ней проблемам.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ В. А. Латышава падзялілася вынікамі агляду кнігі А. І. Харавашэвіч і А. В. Шаркова **«Обелиски памяти Русской Императорской армии Первой мировой войны»** (Минск : Белпринт, 2018. – 328 с.). Во вступительном слове к книге «Обелиски памяти Русской Императорской армии Первой мировой войны» Бернд Александр Байерль, Чрезвычайный и Полномочный Посол Австрии в Республике Беларусь (2016–2018 гг.) справедливо отметил: «Патриотические жертвы этой войны с русской стороны были огромны, и они заслуживают достойного почитания их памяти».

«Достойное почитание памяти» – именно так можно охарактеризовать результат работы Елены Ивановны Хорошевич и Анатолия Васильевича Шаркова, нашедший свое отражение на страницах книги «Обелиски памяти

Русской Императорской армии Первой мировой войны». Нельзя не согласиться и с Петером Деттмаром, Чрезвычайным и Полномочным Послом Федеративной Республики Германия в Республике Беларусь (2015–2019 гг.), который сравнил эту книгу с символическим мемориалом всем павшим на полях Великой войны – полосой британских воинских захоронений, простирающейся от побережья Ла-Манша до Соммы и далее (с. 4).

Книга «Обелиски памяти Русской Императорской армии Первой мировой войны» выступает продолжением таких авторских работ, как «Воинские захоронения Первой мировой войны» / А. В. Шарков, В. Д. Селеменев (Graz ; Minsk : НАРБ, 2010); Последний приют солдата / А. В. Шарков, В. Д. Селеменев Ю. А. Бествицкий, Е. И. Хорошевич (Минск: Звязда, 2014), изданных одновременно на русском и немецких языках. На их страницах ранее авторы обращались к проблемам сохранения и содержания австро-венгерских, немецких и российских воинских захоронений только на территории Республики Беларусь (Брестская, Витебская, Гродненская и Минские области).

В основу книги «Обелиски памяти Русской Императорской армии Первой мировой войны» положены результаты, в том числе полевых исследований, поисковой экспедиции на территории как наших ближайших соседей (Российской Федерации, Польши, Украины, Литвы, Латвии), так и ряда других европейских государств (Австрии, Венгрии, Германии, части Италии (Южный Тироль), Румынии, Сербии, Словакии, Словении, Франции, Чехии). Объектом внимания здесь выступили «затерянные во времени и памяти скромные погосты, грандиозные мемориалы и одиночные могилы» (Предисловие, с. 6).

Книга в определенной степени отражает генезис культуры памяти в нормативных правовых документах локального характера. Она строиться с привлечением значительного количества архивных фотоснимков, например, в случае с военным кладбищем № 14 в с. Цеклин (с. 76), воинским кладбищем № 6, с. Кремпна (86), военным кладбищем в с. Стара Гадка (142) на территории Польши. В Украине, например, – это фотографии церемонии закладки храма-памятника погибшим воинам на Братском кладбище в Киеве 12 июня 1916 г. (с. 209).

Пожалуй, особое исследовательское внимание сегодня заслуживает ряд синонимичных названий в историографии применительно к такой непоправимой катастрофе, как Первая мировая война. Авторы рассматриваемой книги еще в предисловии отмечают интернациональный характер этой отправной точки для крушения идей гуманности в XX веке.

Структура функций исторической науки включает в себя такой элемент, как социальная память. Не зря в современных реалиях сохраняет свою безусловную востребованность первостепенность этой функции. Эту мысль на протяжении каждой страницы доносят до читателей и авторы книги «Обелиски памяти Русской Императорской армии Первой мировой войны» Е. И. Хорошевич, А. В. Шарков. Авторы успешно реализуют следующие, так необходимые в современном обществе черты данной функции (утверждение

справедливости и умиротворение), что способствует у нынешних поколений и восприятию общности трагедии. Примером подобного подхода может служить включение в книгу захоронений из г. Пушкино Калининградской области Российской Федерации (территория бывшей Восточной Пруссии). Где на мемориальной плите с пирамидой есть следующая эпитафия:

«Кто тебе служили
С клятвой на устах
Головы сложили
На семи фронтах
А кто тебя любили –
Где теперь оне?
В придорожной пыли
Их прокляли убили
На мировой войне

В память о захороненных здесь 601 русскому и 196 немецких солдатах 1914 – 1915 гг.» (с. 52).

И этот пример на страницах книги не единичен. Так, в издание включены и такие объекты культурного наследия, как захоронение воинов в Российской Федерации: г. Гусев, где «похоронены солдаты Первой мировой войны 1914 г.»: 17 русских и 44 немецких (с. 43); захоронение в п. Ильинское, где «захоронено воинов: 66 русских и 77 немецких» (с. 48); на территории Польши: д. Терновец, «захоронено воинов: 34 русских и 7 австро-венгерских», с. Воля-Цеклиньска, «захоронено воинов: 44 русских, 48 немецких и 22 австро-венгерских» (с. 68), г. Новы-Жмигруд, «захоронено воинов: 149 русских, 5 немецких, 58 австрийских, 1 польский, 1 гражданское лицо» (с. 78), г. Дукля, «захоронено воинов: 3 588 различной национальности» (с. 106), д. Гулков: «Здесь покоятся солдаты войны 1914–1918», г. Ламбиновцы, захоронено воинов: 3 571 русский, 2 602 румынских, 244 итальянских, 286 сербских, 83 британских, 80 французских, 2 бельгийских, 1 греческий (с. 186), Греция, г. Салоники, захоронено воинов: 400 русских, более 8 000 французских, более 7 400 сербских, более 3 000 итальянских и 1 600 британских (с. 241).

Особое внимание следует уделить и реализации указанного выше подхода авторов в привлечении, в том числе, материала о захоронениях воинов Русской Императорской армии, принадлежащих к разным вероисповеданиям. Отдельно отметим, что сама возможность подготовки и издания книги стала возможной в рамках реализации воистину уникального проект «Жить и помнить», осуществляемого при помощи Всехсвятского прихода г. Минска и с благословления его настоятеля протоиерея Федора Повного. Так, Е. И. Хорошевич и А. В. Шарков дают возможность широкой аудитории познакомиться с культурой памяти о русских военнопленных православного и иудейского вероисповедания на военном кладбище в г. Миловице, Чехия (с. 247); группой надмогильных памятников на месте захоронения воинов Русской имперской армии мусульманского (с. 219), иудейского вероисповедания (с. 223), г. Вильнюс, Литва и др.

Авторы «Обелисков памяти Русской Императорской армии Первой мировой войны» раскрывают и еще одну из проблем, часто выступающих «неудобными» для истории любой войны – военнопленные. Однако, освещение данной темы необходимо не только памяти ушедших, но и живых. Примером могут служить отражение в книге «Обелисков памяти Русской Императорской армии Первой мировой войны» таких памятных мест среди захоронений воинов, как захоронение военнопленных в Праге, Чехия (с. 267); г. Брунико (с. 290–296), г. Санта Кристина (с. 299–304), Италия; г. Франкфурт-на-Одере, г. Пуххайм, г. Эрланген в Германии и многих других.

Ад наступнай кнізе А. В. Шаркова і А. І. Харашэвіч «Жить и помнить» Кн. 1 (Минск: Звязда, 2015) распавёў загадчык адзела ваеннай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі доктар гістарычных навук, прафесар А. М. Літвін. Ён адзначыў, што гэта выданне будзе карысным ветэранам Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў, ветэранам ваеннай службы, дзяржаўным і ваенным структурам, ваенным гісторыкам, моладзі і ўсім, хто цікавіцца гэтай тэматыкай. Кніга можа таксама стаць даведнікам для родных і блізкіх, якія наведваюць месцы пахавання загінуўшых сваякоў за межамі Беларусі.

Гэта кніга была прысвечана 70-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг. Аўтары адзначаюць, што яна ўяўляе сабой толькі першую частку па рэалізацыі ўнікальнага праекта, які быў ажыццёўлены ў рамках агульнадзяржаўнай праграмы па ўсенароднай захаванні вечнай памяці аб продках. Ідэя праекта заключаецца ў тым, каб сабраць матэрыял аб воінах, нашых суайчынніках, якія загінулі па-за межамі радзімы ў гады Другой сусветнай вайны.

Праектам прадугледжвалася наведванне месцаў баёў, пошук вайсковых пахаванняў, іх вывучэнне, фотаздымкі, відэазапіс і ўзяцце зямлі з месцаў пахавання для крыпты праваслаўнага храма-помніка ў гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, хто служыў выратаванню Айчыны, у горадзе Мінску. Гэта, безумоўна, дазволіць родным і блізкім, хто не мае магчымасці самастойна ажыццявіць такую далёкую паездку да месцаў пахавання, дакрануцца да святыні-зямлі і памаліцца аб супакаенні душ загінуўшых. Не менш важнай з'яўляецца і інфармацыя аб месцы пахавання і яго стане.

Першая экспедыцыя прайшла па месцах баёў Чырвонай арміі і гібелі савецкіх воінаў у гады Другой сусветнай вайны па рэгіёнам Германіі, Аўстрыі, Венгрыі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі і Італіі, з якімі наладжаны кантакт, і дзе была аказана дапамога пры рэалізацыі праекта. У выніку ўдалося наведаць некаторыя месцы, якія прадстаўляюць ўсе катэгорыі ахвяр вайны, што палеглі ў згаданых краінах. Гэта магілы ваеннаслужачых Чырвонай арміі, якія загінулі ў баях, ці тых, хто аддалі жыццё дзеля захавання міру; ваеннаслужачых, якія былі замучаны у нацысцкіх канцэнтрацыйных лагерах; савецкіх грамадзян – прымусовых рабочых, хто памёр ад непасільнай працы, і непаўналетніх вязняў.

У кнізе адначаецца, што з мэтай разгрому акупантаў і вызвалення краін Еўропы германскага нацызму ў 1944 – 1945 гг. Савецкія узброеныя сілы правялі буйныя наступальныя аперацыі – Яска-Кішынёўскую, Львоўска-Сандамірскую, Будапешцскую, Венскую, Берлінскую, Пражскую і інш. У іх бралі ўдзел 11 франтавых аб'яднянняў, 2 франты СПА, 4 флаты, 50 агульнавайсковых, 6 танкавых, 13 паветраных армій, 3 арміі СПА і 3 ваенных флатыліі. Каля 8 млн савецкіх воінаў больш за год вялі ўпартыя баі з ворагам на тэрыторыі 10 краін Еўропы плошчай каля 2,2 млн кв. км. Была цалкам ці часткова вызвалена тэрыторыя Румыніі, Польшчы, Балгарыі, Югаславіі (усходнія раёны), Чэхаславакіі, Венгрыі, Аўстрыі, Германіі (усходнія раёны). Былі вызвалены еўрапейскія сталіцы – Бухарэст, Бялград, Будапешт, Варшава, Вена, Прага, Софія, Берлін.

Як сцвярджаюць аўтары кнігі, звыш аднаго мільёна савецкіх воінаў загінулі ў жорскіх баях на палях Еўропы, выконваючы вызваленчую місію. Воінскія магілы ці могілкі герояў, густа рассеяны ад Буга на захад па еўрапейскіх краінах, што сведчыць аб той вялікай ахвяры, якую савецкія людзі прынеслі ў імя выратавання еўрапейскіх народоў ад гітлераўскага знішчэння.

Вынікамі выканання першай часткі праекта стала тэкставая інфармацыя і фотаматэрыялы па 24 мемарыялах і мемарыяльных могілках савецкім воінам, невядомаму салдату, брацкіх магілах, вайсковых пахаваннях, брацкіх магілах непаўнелетнім вязням у Берліне, (Германія); 9 помнікаў савецкім воінам-вызваленцам, савецкім ваеннапалонным і прымусова выгнаным грамадзянам, інтэрнацыянальных воінскіх могілках; 5 могілках савецкіх воінаў, савецкіх ваеннапалонных, мемарыяльных могілках у Венгрыі; 4 мемарыялах савецкім воінам, пахаванні савецкіх воінаў, брацкай магіле ў Чэхіі; мемырыяльных могілках ў Славакіі; 2 памятных месцах на тэрыторыі Італіі, у тым ліку воінскіх брацкіх могілкаў у Стальена і 180 імёнаў мемарыяла Монтэ-Касіна.

У якасці дадаткаў аўтары прыводзяць 4 дакументы, сярод якіх Загад народнага камісара абароны СССР № 138 з аб'яўленнем палажэння аб асабістым уліку страт і пахаванні загунуўшага асабовага складу Чырвонай арміі ў ваенны час, Спіс савецкіх ваеннапалонных, ураджэнцаў Беларусі, хто памёр у лагеры Цайтхайн (Германія), спіс пахаваных у г. Секешфехервар пасля 1956 г. (Венгрыя), Спіс пахаваных на могілках пад Монтэ-Касіна (Італія).

Важнай адметнасцю гэтай кнігі з'яўляецца багаты фотаматэрыял, зроблены ўласнаручна аўтарамі і шырока прадстаўлены ў кнізе.

Абмеркаванне кніг паказала, што на саісканне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры 2020 года вылучаны грунтоўныя працы А. В. Шаркова і А. І. Харашэвіч, якія знайшлі агульную падтрымку ўдзельнікаў канферэнцыі.

*Пётр Аляксандравіч Канцавы,*
*кандыдат гістарычных навук;*
*Вікторыя Аляксандраўна Латышава,*
*кандыдат гістарычных навук;*
*Сяргей Яўгенавіч Новікаў,*
*кандыдат гістарычных навук*